малявалі знікаючыя віды жывёл і раслін, і пісалі для іх тэксты-каментары. На маляванні дзеці прыдумалі знакі, якія заклікаюць да асцярожнага стаўлення да прыроды, малявалі птушак, а на ўроках працы рабілі для іх кармушкі.

Падводзячы вынікі, неабходна яшчэ раз падкрэсліць, што сучасны ўрок па прадмеце «Літаратурнае чытанне» не павінен быць адасоблены ад іншых, сумежных прадметаў. Неабходна як мага шырэй выкарыстоўваць міжпрадметныя сувязі дысцыплін культуралагічнага цыклу. Такая інтэграцыя ўрокаў дазваляе выхоўваць у вучняў эстэтычны густ, маральныя асновы і ў цэлым гарманічна развітую асобу.

ЛІТАРАТУРА:

1. Федорец, Г. Ф. Межпредметные связи в процессе обучения : учеб. пособие / Г. Ф. Федорец. – М. : ЛГУ, 1983. – 88 с.

# БЕЛАРУСКАЯ ТРАДЫЦЫЯ: З ГІСТОРЫІ Ў СУЧАСНАСЦЬ

УА «Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія»
Кляшчук Д. А., Мацюшка І. С., студэнткі 2 курса факультэта бізнесу і права
Кафедра лінгвістычных дысцыплін
Навуковы кіраўнік– к. філал. н., дацэнт Скікевіч Т. І.

Цяжка вызначыць час, калі нашы продкі пачалі адзначаць святы. Хіба што яныпрысутнічалі ў іх жыцці заўсёды. Абрады, звязаныя з пакланеннем Сонцу, Зямлі, Небу і гэтак далей, дапамагалі ім арыентавацца ў часе, калі яшчэ не было календароў, і нараджалі веру і надзею на лепшае.З пакалення ў пакаленне беларусы захоўвалі гісторыю продкаў і традыцыі. Самабытнасць і павага вытокаў захаваліся да сённяшняга дня. Памяць застаецца ў выглядзе традыцый і звычаяў, вуснай народнай творчасці, забабонах і прыметах, у асаблівасцях нацыянальнай кухні.

Традыцыі беларускай культуры ўяўляюць сабой перапляценне хрысціянства і паганства, сямейных і грамадскіх святаў. Захаваліся агульнаславянскія традыцыі. Сярод праваслаўных традыцый адзначаецца Вялікдзень, Радаўніца, Троіца, Пятроў дзень, Ілья, Яблычны Спас, Пакроў. Масленіца, Каляды і Купалле–гэта перажыткі паганскай культуры, злучаныя з буйнымі каляндарнымі святамі і пастамі.

«Сонца, паветра і вада–нашы лепшыя сябры». Гэтая прымаўка лепш за ўсё падыходзіць да дня Івана Купалы. Бо менавіта з вадой і сонцам звязаны даўнія купальскія абрады.

Святы ў гонар летняга сонцастаяння ёсць у многіхнародаў Еўропы: Янаў дзень у Балгарыі, святы Ян у Венгрыі, Сан-Хуан у Іспаніі, Ліга ў Латвіі. Ва ўсходніх славян гэта Іван Купала, але, бадай, менавіта ў Беларусі найбольш поўна захаваліся традыцыі Купалля, якое адзначаюць з асаблівым размахам.

Лічыцца, што ў гэты дзень адбываюцца незвычайныя рэчы: звяры пачынаюць размаўляць, дрэвы ажываюць, а ў рэках і азёрах можна назіраць, як плаваюць русалкі. Дзень напоўнены вялікай колькасцю паданняў. І ніхто не



Репозиторий ГрГМУ

можа высветліць, што праўда, а што хлусня. Купалле лічыцца адным з самых старажытных святаў і мае паганскія карані. Яго святкаванне было звязана з днём летняга сонцастаяння. Нашы продкі звязвалі свята Купалле з культам сонца. Ды і само слова *купала* азначала істоту гарачую, сярдзітую, ярую, якая кіпіць гневам. У тыя часы ўсе гэтыя вызначэнні адносіліся да сонца. У купальскую ноч людзі дзякавалі Агню, Вадзе і Зямлі. У гэты дзень, паводле паданняў, праходзіла ачышчэнне агнём і вадой.

Паганскія вераванні пасля прыняцця хрысціянства цесна перапляліся з хрысціянскімі. У гэты дзень сталі шанаваць Іаана Хрысціцеля. Лічылася, што менавіта ў дзень летняга сонцастаяння і нарадзіўся Ян Хрысціцель. Акрамя таго, людзі заўважылі сугучча слоў «купала» і «купаць», «апускаць у ваду», а так як хрышчэнне праходзіла з дапамогай вады, то і прынялі з лёгкасцю царкоўную версію свята.

Адным з абрадаў у купальскую ноч быў пошук папараць-кветкі. Менавіта ён па звычаю меў ключ да ўсяго таго, што адбываецца. Гаспадар гэтай кветкі разумеў гаворку жывёл і птушак, глядзеў на русалак і назіраў, як перамяшчаюцца дрэвы з месца на месца. Гэта расліна не адзіная кветка, якой пакланяліся нашы прадзеды. У той час лічылі, што ўсе кветкі надзеленыя неверагоднай гаючай сілай. Жанчыны і дзеці збіралі розныя травы, асвятлялі іх у царкве і лячыліся імі цэлы год.

Ніводная купальская ноч не абыходзілася без вогнішча: ачышчэнне агнём было самым важным рытуалам Купалля. Абавязковым атрыбутам было запаленае кола, якое ўздымалі на тычцы ўверх. Яно сімвалізавала сонца. Існавала такое павер’е, звязанае з агнём: лічылася, што калі кінуць у вогнішча кашулю хворага дзіцяці, то разам з адзеннем згараць і ўсе хваробы. У агонь кідалі ўсе старое і непатрэбнае, і пры гэтым прасілі новага хлеба, лёну, пладавітасці хатнім жывёлам. Важны быў і яшчэ адзін рытуал–ачышчэнне вадой. Калі выкупацца ў гэтую ноч, то чыстым будзеш адчуваць сябе ўвесь год, – так абвяшчала павер’е. Раніцай пасля свята ўсе каталіся па расе, мяркуючы, што яна дасць сілы і здароўе на ўвесь год.

Купалле заўсёды было адным з самых вясёлых і разгульных святаў. Па традыцыі святкаваць павінна была ўся вёска, бо такое яднанне пры выкананні абрадаў гарантавала дабрабыт кожнаму жыхару. Спаць у купальскую ноч лічылася страшным грахом.

Сёння Купалле святкуюць не ў такіх маштабах, але чакаюць яго з тым жа нецярпеннем. Да гэтага часу яно з’яўляецца адным з самых вясёлых масавых гулянняў, якое працягваецца цэлыя суткі. Штогод у гэтыя дні ў кожным населеным пункце краіны праводзяцца святочныя мерапрыемствы, якія ўключаюць канцэрты, вясёлыя гульні, карагоды і, зразумела, вогнішча.

Убачыць Купалле можна ў самых розных мясцовасцях Беларусі, але ёсць і найбольш вядомыя, масавыя гулянні.Самае маштабнае свята Купалле – «Александрыя збірае сяброў»– праходзіць у Шклоўскім раёне Магілёўскай вобласці. За некалькі гадоў яно стала сапраўдным брэндам краіны: сюды прыязджаюць шматлікія госці не толькі з Беларусі, але і Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы і іншых краін свету.



Рэпазіторый ГрДМУ

ЛІТАРАТУРА:

1. Бондаренко, Э. О. Праздники христианской Руси / Э. О. Бондаренко. – Калининград : Кн. изд-во, 1993. – 105 с.

2. Руднев, В. А. Обряды народные и обряды церковные / В. А. Руднев – Л. : Лениздат, 1982. – 63 с.

3. Рыбаков, Б. А. Язычество Древней Руси / Б. А. Рыбаков. – М. : Наука, 1995. – 257 с.

## У АРНАМЕНЦЕ НАША ГІСТОРЫЯ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Коўш В. В., студэнт 1 курса лячэбнага факультэта
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В. І.

Арнамент – гэта найбольш вядомы від мастацкай творчасці нашага народа. Ткацтва, пашыў адзення, ганчарная справа, вышыўка – усё гэта прасякнута выкарыстаннем спецыфічнага беларускага арнаменту. Арнаменту, ідэнтычнага якому ў свеце няма. Між тым, мала хто з сучасных беларусаў ведае спецыфіку ўзораў, якія выкарыстоўваў яго народ.

Арнамент – гэта няпроста нейкі малюнак, а сымбал. Кожная дэталь арнаменту штосьці абазначае.Арнамент – гэта асаблівы ўзор. Ён складаецца з элементаў, якія рытмічна паўтараюцца і чаргуюцца адзін з адным. У выніку ўтворыцца арнаментальны шэраг. Гэта свайго роду намаляваны верш. У ім могуць прысутнічаць самыя розныя малюнкі. Але, як правіла, яны вельмі абагульненыя і схематычныя. Не заўсёды іх лёгка пазнаць.

Узоры і арнаменты – гэта цэлы свет, загадкавы і дзіўны. На іх можна глядзець доўга і кожны раз заўважаць новыя нюансы. Што такое ўзор – гэта зразумела шматлікім. Так называюць малюнак, у якім спалучаюцца паміж сабой лініі, фарбы, фігуры. Часам ідэю падказвае сама прырода – дастаткова ўспомніць марозныя галінкі на шыбе.

Народнае мастацкае ткацтва – адзін з самых пашыраных відаў народнага выяўленчага мастацтва. Але было б зусім няправільна ацэньваць яго толькі з пазіцыіі прыгажосці, арыгінальнасці арнаментыкі, каларыту. Кожны ўзор – гэта сімвал – ураджаю, працы, шчасця, святаў, павагі да продкаў, кахання.

Беларускі арнамент захаваў у сабе старажытную язычніцкую культуру і міфалогію. Шматлікія ўзоры прысвечаныя беларускім язычніцкім багам – Ярыле, Ладзе, Жыжалю, Маці-Зямлі. Калі вышывальшчыца ці ткачыха аздабляла такімі ўзорамі сваю працу – гэта азначала тое, што яна звярталася за дапамогай да гэтых багоў. Былі таксама арнаменты, прысвечаныя і святам такім, як Купалле, Каляды, Дзяды і іншыя. Цікава, яшчэ і тое, што ва ўяўленнях беларусаў гэта не пярэчыла хрысціянскай веры. Ручнік з такім арнаментам мог быць ахвяраваны ў царкву і ёю прыняты.

У беларускім арнаменце можна вылучыць некалькі асноўных матываў:



Репозиторий ГрГМУ